# Шлях культуры Агінскіх: *стратэгічны накірунак*

У канцы ліпеня ў літоўскім горадзе Рэтавас з ініцыятывы Маладзечанскага Мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» і пры падтрымцы Рэтаўскага музея гісторыі і культуры Агінскіх прайшоў круглы стол «Беларусь – Літва: на шляху культурнага супрацоўніцтва». У ім прынялі ўдзел кіраўнікі ўстаноў культуры Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацыяў і бізнес-саюзаў. Асноўнымі мэтамі круглага стала былі падвядзенне вынікаў сумеснай працы, накіраванай на адраджэнне культурнай спадчыны роду Агінскіх, і вызначэнне прыярытэтных напрамкаў супрацоўніцтва на перыяд 2013–2015 гг.

У сучасных умовах глабалізацыі менавіта міжнародныя праекты становяцца моцнымі сродкамі дыпламатыі і механізмам сацыякультурнай інтэграцыі. Прызнаючы важнасць сумесных міжнародных акцыяў і праектаў у развіцці міжкультурнага дыялогу Літвы, Беларусі і іншых краінаў Еўропы, мэр горада Рэтавас Антанас Чарнецкіс адзначыў: «Мы аб'ядноўваем людзей розных краінаў са сваёй унікальнай культурнай спадчынай. Разнастайнасць і творчае багацце – умова поспеху на культурным шляху».

Дырэктар Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага Р. Сарока і дырэктар Рэтаўскага музея гісторыі і культуры Агінскіх В. Руткаўскас, станоўча адзначаючы культурныя мерапрыемствы, рэалізаваныя ў 2011–2013 гг. у межах міжнародных праграмаў «Масты спадчыны Агінскіх» і «Шляхамі паланезаў Агінскага», абвясцілі асноўныя накірункі далейшага супрацоўніцтва. «Наш праект адкрыты ўсім зацікаўленым і неабыякавым да нашай агульнай культуры і гісторыі. Спадзяюся на ўзбагачэнне нашага культурнага асяродку новымі ідэямі і цікавымі праектамі ў розных сферах творчай дзейнасці», – адзначыў В. Руткаўскас. Сапраўды, толькі агульнымі намаганнямі энергічных творчых асобаў магчыма паспяховая рэалізацыя любога праекта.

Адзначым, што пры ўдзеле фонду «Спадчына М.К. Агінскага» былі праведзеныя міжнародная навуковая канферэнцыя «Палітычная і культурная дзейнасць князёў Агінскіх: рэфлексіі мінулага, перспектывы будучыні» (Вільня), моладзевы баль (сумесна з духоўна-асветніцкім аб'яднаннем «Светач» Палаца культуры г. Маладзечна), выстаўка беларускіх мастакоў у Мінскім абласным краязнаўчым музеі, мастацкі пленэр і іншыя. Распрацаваны шэраг турыстычных маршрутаў па Беларусі, Літве і Польшчы. Усталяваныя кантакты і падпісаныя дамовы з калегамі са Швецыі і Італіі, аб чым таксама ішла гаворка пад час працы круглага стала.

Рэжысёр культурных праграмаў Віргінія Каханскіце, распавядаючы аб праграме «Шлях паланезаў Агінскага», засяродзіла ўвагу на яе асветніцкім і іміджавым аспектах. Нагадаем чытачам, што ў межах дадзенай праграмы быў рэалізаваны міжнародны музычны праект – гастрольнае турнэ «Музыка княжацкага роду Агінскіх» (Рэтавас–Вільня–Маладзечна–Мінск–Масква) сумесна з Расійскай акадэміяй музыкі імя Гнесіных (Масква) і Нацыянальнай школай мастацтваў імя Чурлёніса (Вільня).

З цікавымі прапановамі на круглым стале выступілі загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прафесар А. Смолік, краязнаўца С. Верамейчык, старшыня Мінскага згуртавання нашчадкаў шляхты і дваранства І. Чакалаў, дырэктар Нацыянальнага музея імя М.К. Чурлёніса О. Даўгеліс, дырэктар Жэмайційскага мастацкага музея А. Баканаўскас і іншыя.

Кульмінацыяй мерапрыемства стаў прагляд дакументальнай стужкі аб жыцці і творчасці М.К. Агінскага, знятай РУП «Беларускі відэацэнтр» (рэжысёр Анастасія Мірашнічэнка).


Фота Ірыны РУХЛІ

У бліжэйшы час плануецца распрацаваць міжнародную культурную праграму «Шлях культуры Агінскіх», прымеркаваную да святкавання 250-годдзя з дня нараджэння кампазітара, разам з нацыянальнымі камісіямі па справах ЮНЕСКА Беларусі і Літвы пры падтрымцы ідэі міністэрствамі культуры і замежных справаў нашых краінаў.

По выніках круглага стала была падпісаная рэзалюцыя, у якой вызначаны шэраг мерапрыемстваў на 2013–2015 гг.

*Павел САПОЦЬКА*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ